# НЕБЯСПЕЧНЫ ЭЛЕКТРАВЕЛАСІПЕД

## Судмедэксперты расказалі аб некаторых выпадках і прычынах узгарання гэтага транспартнага сродку

**Жыхарка Шчучынскага раёна ўбачыла, што з зарадкай акумулятара яе электравеласіпеда ўзнікла праблема. Але не надала гэтаму значэння. Яна спакойна пакінула свой двухколавы транспарт у гаспадарчай пабудове і паехала на работу. Праз некаторы час суседзі паведамілі ў МНС аб пажары той самай пабудовы. Было ўстаноўлена, што крыніцай узгарання стаў электравеласіпед, акумулятарная батарэя якога поўнасцю выгарала. Вынікі судовай пажарна-тэхнічнай экспертызы паказалі, што прычына пажару звязана з аварыйным станам электратэхнічнага абсталявання, у прыватнасці літый-іоннай батарэі.**



Фота УДКСЭ па Гродзенскай вобласці.

Як патлумачыў **начальнік упраўлення спецыяльных экспертыз УДКСЭ па Гродзенскай вобласці Дзяніс КРАПІЎНІЦКІ,** у сучасным свеце выкарыстоўваецца вялікая колькасць электраабсталявання, якое здольнае функцыянаваць без пастаяннага падключэння да электрычных сетак. Такую магчымасць даюць акумулятары. Адны з самых папулярных — літый-іонныя і літыевыя. Яны выкарыстоўваюцца ў якасці элементаў падзарадкі ў электратранспарце, мабільных тэлефонах, гідраскутарах, партатыўным абсталяванні, лічыльніках цяпла і іншых. Нягледзячы на практычнасць, існуе высокая пажарная небяспека гэтых прылад. Таму вельмі важна выконваць правілы іх эксплуатацыі і зарадкі. Як паказвае практыка, не ўсе ўладальнікі ведаюць гэтыя правілы, у прыватнасці аб тым, што нельга дапускаць перагравання батарэі.

Менавіта з такім выпадкам сутыкнуліся эксперты пры ўстанаўленні прычыны ўзгарання электравеласіпеда ў гродзенскім мікраёне Фолюш. Пажар удалося хутка лакалізаваць, але гаспадар веласіпеда вырашыў высветліць: у чым была справа? Па дапамогу звярнуўся да спецыялістаў. Судовыя эксперты ўстанавілі, што зонай пажару была задняя частка веласіпеда, дзе знаходзіцца электронны блок кіравання з акумулятарам. Прычынай узгарання якраз і стаў гэты блок. Магчыма, ад высокага награвання альбо няспраўнасці.

Дзяніс Крапіўніцкі ўдакладніў, што ў кожнай прыладзе з выкарыстаннем Li-ion ёсць мікрасхемы, якія кіруюць зарадкай і не павінны дапускаць перагравання батарэі. У цэлым мікрасхемы працуюць надзейна, аднак доўгая зарадка можа прывесці нават да выбуху. Таму варта карыстацца толькі штатнымі зараднымі прыладамі, якія распрацаваны спецыяльна для таго ці іншага аб'екта. Яны могуць абмяжоўваць велічыню току. У той жа час няштатныя зарадныя прылады могуць прывесці да няправільнага працэсу зарадкі акумулятара і, адпаведна, пажару.

У ліку прычын узгарання — парушэнне герметычнасці батарэі. У гэтым выпадку ў корпус трапляюць кісларод і пары вады. Яны ўступаюць у рэакцыю з матэрыяламі электродаў і электраліту. Як вынік — перагрэў і выбух. Парушэнне герметычнасці можа адбыцца не толькі ў выніку механічнага пашкоджання акумулятара, але і ў выпадку яго перазарадкі.

Вось чаму падчас зарадкі электронныя прылады не павінны заставацца без нагляду. Не варта карыстацца і захоўваць акумулятарныя батарэі з пашкоджаным корпусам, якія працёк, набываць акумулятары сумнеўнага паходжання. Таксама судмедэксперты рэкамендуюць захоўваць электронныя прылады з літый-іоннымі батарэямі далей ад прадметаў, якія хутка ўзгараюцца.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

Ваша права

# МЯНЯЦЬ НЕЛЬГА КАРЫСТАЦЦА

## Умовы чарговага паўгоддзя дадатковага «жыцця» дакументаў

**Трэцяя хваля працягнення дзеяння афіцыйных папер і даведак у Беларусі разлічана на паўгода і датычыцца дакументаў, тэрмін якіх скончыўся з 10 лістапада 2020-га да 10 лістапада 2021-га. Аднак калі ўладальнік пратэрмінаванай паперы ўжо скарыстаўся правам на "другое жыццё", то працягнуць тэрмін дзеяння яшчэ раз ужо будзе нельга — прыйдзецца пераафармляць. Пра акалічнасці і магчымасці чарговага працягнення дзеяння дакументаў расказала намеснік начальніка ўпраўлення прававога рэгулявання канстытуцыйнага будаўніцтва і праваахоўнай дзейнасці Міністэрства юстыцыі Марына МЕЛЬНІКАВА.**

### ПАДОЎЖЫЦЬ САПРАЎДНАСЦЬ МОЖНА ТОЛЬКІ РАЗ

Нагадаем, што першы раз працягненне на тры месяцы тэрміну дзеяння пераліку з 380 дакументаў, якія сталі несапраўдныя ў перыяд з 30 красавіка да 31 ліпеня 2020 года, адбылося летась у маі. Лістападаўскі ўказ 2020-га датычыўся дакументаў, якія станавіліся несапраўднымі з 10 лістапада 2020-га да 10 мая 2021-га. «Жыццё» 351 адміністрацыйнай працэдуры для грамадзян і юрыдычных асоб ды індывідуальных прадпрымальнікаў (ІП), а таксама 12 найменняў дакументаў, выдадзеных фізічным, юрыдычным асобам і ІП, працягвалася ўжо на паўгода. Майскі ўказ 2021-га робіць жыццяздольным 361 дакумент, тэрмін якіх скончыўся ці завяршаецца ў час з 10 лістапада 2020-га да 10 лістапада 2021-га.

— Важна памятаць, што тэрмін дзеяння дакументаў у трэці раз падаўжаецца адназова, — падкрэсліла Марына Мельнікава. — Калі, напрыклад, тэрмін дзеяння даведкі скончыўся 15 красавіка 2021-га, яна будзе сапраўдная яшчэ шэсць месяцаў — да 15 кастрычніка. Аднак яшчэ раз працягнуць дзейснасць гэтай даведкі ўжо будзе нельга, хоць яна і будзе канчацца ў абазначаны ў апошнім указе тэрмін, бо паўторнае прадаўжэнне дзеяння дакумента законам не прадугледжана. Уладальнік такога дакумента павінен будзе звярацца ў кампетэнтны орган па выдачу новай паперы.

### ДВАНАЦЦАЦЬ — ДАДАЛІ, ДВА — ПРЫБРАЛІ

У другі раз змяненні ў пералік дакументаў, сапраўднасць якіх прадаўжалася на паўгода, былі скіраваны на найбольш запатрабаваныя ў насельніцтва паперы (пашпарт, пасведчанне кіроўцы, даведка пра стан здароўя, шэраг дазвольных дакументацый для суб'ектаў гаспадарання).

— Новы пералік дапоўнены 12 дакументамі, якія выдаюцца суб'ектам гаспадарання, па пытаннях прамысловай і пажарнай бяспекі. А два дакументы з пераліку выключаны, таму што заканадаўствам больш не прадугледжана іх атрыманне. Гэта выдача выпіскі з Адзінага рэестра дзяржаўнай маёмасці аб уліку (адсутнасці) нерухомай маёмасці ў дадзеным рэестры. А таксама выдача дубліката пасведчання аб рэгістрацыі транспартнага сродку, — удакладніла прадстаўніца Мінюста.

Поўны пералік папер, тэрмін дзеяння якіх падоўжаны, можна пабачыць у актуалізаванай пастанове Саўміна ад 2 снежня 2020 г. № 687 «Аб дакументах, тэрмін дзеяння па якіх працягваецца», што змешчана на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале pravo.by. Калі чалавека цікавіць канкрэтны дакумент, то ён можа звярнуцца ў дзяржорган ці арганізацыю, што адказвае за яго выдачу.

### ЗАГАДЗЯ ЦІ Ў АПОШНІ ДЗЕНЬ

Час дзеяння афіцыйных папер, тэрмін сапраўднасці якіх завяршаецца з 10 лістапада 2020-га да 10 лістапада 2021-га, працягваецца аўтаматычна. Чалавеку не трэба ездзіць ні ў якія ўстановы, каб паставіць нейкі дадатковы штамп. Разам з тым, ніхто не забараняе грамадзянам, якія хочуць памяняць дакумент, зрабіць гэта ў зручны для іх час і не чакаць скanчэння тэрміну падаўжэння, абазначанага ўказам. Але ж і зацягваць да апошняга дня не варта, параіла Марына Мельнікава:

— Працягненне дзеяння пэўных афіцыйных папер мае на мэце зніжэнне адміністрацыйнай нагрузкі на фізічных і юрыдычных асоб падчас мерапрыемстваў па прафілактыцы COVID-19. Многія проста фізічна не могуць своечасова звярнуцца па замену дакументаў з шэрагу прычын: з-за нахождання на самаізаляцыі, у водпуску, на лецішчы... А за паўгода любы можа выбраць для сябе найбольш зручны час з улікам уласных жыццёвых абставін і звярнуцца па новы дакумент.

Калі тэрмін дзеяння дакумента канчаецца, напрыклад, 10 лістапада 2021-га, то ён будзе прыдатны для выкарыстання яшчэ паўгода — да 10 мая 2022-га, як абазначана ва ўказе. Аднак пачынаць думаць пра замену пашпарта, падоўжаная прыдатнасць якога канчаецца, напрыклад, 5 мая 2022-га, у першы майскі дзень, — не самае лепшае рашэнне. Чалавек яўна не паспее зрабіць гэта за пяць дзён, удакладніла спецыяліст.

### КАЛІ ТЭРМІН ПАДОЎЖАНЫ, А ДАКУМЕНТ НЕПРЫДАТНЫ...

Згодна з заканадаўствам, дзеянне дакумента, які выдадзены пры ажыццяўленні адміністрацыйнай працэдуры, можа быць спынена выкананнем ці прызнаннем страціўшым сілу, несапраўдным, ануляваннем ці адменай. Адным словам, такая папера страчвае юрыдычную сілу і не можа быць сапраўднай, акрэсліла прадстаўніца Мінюста:

— Возьмем, напрыклад, пашпарт. Калі яго тэрмін дзеяння падоўжаны, аднак на працягу гэтых шасці месяцаў пашпарт стаў непрыдатны для выкарыстання (парушаны сродкі абароны), то такі дакумент неабходна будзе замяніць, нягледзячы на тое, што тэрмін яго дзеяння падоўжаны.

Яшчэ адзін варыянт — прыняцце рашэння аб выдзяленні аднаразовай субсідыі на будаўніцтва ці набыццё жылля. Максімальны тэрмін дзеяння такога дакумента — не больш за тры гады з моманту пералічэння субсідыі. Такім чынам, калі тэрмін дзеяння рашэння быў працягнуты на шэсць месяцаў і за гэты час субсідыя была атрымана, то рашэнне лічыцца спраўджаным і паўторна субсідыя выдавацца не будзе.

У якіх яшчэ выпадках дакумент можа быць прызнаны несапраўдным, залежыць ад кожнай канкрэтнай адміністрацыйнай працэдуры, іншага рашэння кампетэнтнага дзяржоргана, які выдаў дакумент.

### ПАДАТКІ, АЭРАФОТАЗДЫМКА І РЭГІСТРАЦЫЯ ЗАМЕЖНІКАЎ ПРАЗ ІНТЭРНЭТ

Пандэмічная сітуацыя, якая цягнецца ў свеце ўжо другі год, вымусіла многіх перанесці сваю дзейнасць і патрэбы ў інтэрнэт. Анлайн-магчымасці пашырыліся і ў дачыненні да афіцыйных папер. Ужо сёння па атрыманне пэўных даведак і дакументаў можна звярнуцца праз адзіны партал электронных паслуг, не выходзячы з дому. Пералік адміністрацыйных працэдур, па якія можна звярнуцца ў электроннай форме, вызначаны ў пастанове Саўміна № 271. Гэта шэраг працэдур у падатковай і мытнай сферах, галіне сувязі, органах пагранічнай службы, унутраных спраў, абароны, нагадала Марына Мельнікава:

— Гэта, напрыклад, выдача пропуска на права ўезду, часовага знаходжання ў пагранічнай зоне, выдача даведак па пытаннях выплаты падатковых, мытных і іншых плацяжоў, рэгістрацыя замежнікаў, якія часова прыбываюць у Беларусь. Апошняя працэдура, дарэчы, праз інтэрнэт будзе бясплатная, а пры асабістым звароце — за грошы.

Колькасць працэдур пастаянна расце адпаведна з лічбай переведзеных у электронны фармат адміністрацыйных працэдур. У маі, напрыклад, іх пералік чарговы раз папоўніўся на 16 пунктаў.

У электронным выглядзе можна атрымаць, напрыклад, даведку аб наяўнасці (адсутнасці) выканаўчых лістоў ці іншых патрабаванняў аб спагнанні з заяўніка запазычанасці па падатках ці іншых нявыкананых абавязках; даведку аб выплаце (утрыманні) падаходнага падатку з фізічнай асобы (каб пазбегнуць двайнога падаткаабкладання); даведку аб даходах для вырашэння пытання аб перадачы дзіцяці на ўсынаўленне.

А юрыдычныя асобы ці прадпрымальнікі могуць цяпер атрымліваць (завяраць) даведку аб сталым месцазнаходжанні беларускай арганізацыі (каб пазбегнуць двайнога падаткаабкладання). Або рэгістраваць радыёэлектронныя сродкі і (або) высокачастотныя прылады, якія з'яўляюцца крыніцай электрамагнітнага выпраменьвання, грамадзянскага прызначэння. Для іх стала даступнае таксама выдзяленне, адабранне рэсурсу нумарацыі, а яшчэ — выдача дазволу на правядзенне аэрафотаздымкі і аэрамагнітнай здымкі.

### З ДАПАМОГАЙ ЭЛЕКТРОННАГА КЛЮЧА І ПОДПІСУ

Каб звярнуцца па дакумент не выходзячы з дому, чалавек мусіць набыць у Нацыянальным цэнтры электронных паслуг асабісты ключ электроннага лічбавага подпісу. Або атрымаць унікальны ідэнтыфікатар (лагін і пароль), звярнуўшыся асабіста ў службу «Адно акно» ці Нацыянальны цэнтр электронных паслуг.

— Пасля рэгістрацыі на адзіным партале карыстальніку будзе даступная дадатковая інфармацыя па працэдуры, якая яго цікавіць: апісанне, парадак атрымання, тэрмін аказання, кошт, — акрэсліла спецыяліст. — Чалавеку трэба запоўніць прапанаваную сістэмай форму заявы і прыкласці неабходныя дакументы, пасля чаго заяўка на здзяйсненне адміністрацыйнай працэдуры аўтаматычна накіруецца ў дзяржорган, у кампетэнцыю якога яна ўваходзіць. Па выніках разгляду дакументаў заяўніку праз адзіны партал накіруюць паведамленне аб гатоўнасці запытанага адміністрацыйнага рашэння ці непасрэдна само рашэнне.

**Ірына СІДАРОК.**

**Плануецца перавесці ў электронны выгляд яшчэ каля 300 працэдур. У найбліжэйшы час анлайн можна будзе атрымаць наступныя даведкі:**

- аб знаходжанні на ўліку асоб, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў;
- аб займаным памяшканні і складзе сям'і;
- аб месцы жыхарства;
- аб выдзяленні аднаразовай субсідыі на будаўніцтва ці набыццё жылля;
- аб выплаце падаходнага падатку для фізічных асоб.

У электронным выглядзе стануць выдаваць дакумент аб запрашэнні замежніка ў Беларусь, вяртаць выплачаныя звыш меры мытныя падаткі, а таксама здзяйсняць шэраг працэдур у сферы дзяржрэгістрацыі зямельных участкаў і нерухомасці.